ўдасканальваецца новымі формамі і метадамі выхавання, педагогі і навучэнцы знаходзяцца ў пастаянным пошуку новых шляхоў развіцця.

*Спіс літаратуры:*

1. Ожегов, С. И. Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов ; под ред. Н. Ю. Шведовой. – М. : Русский язык, 1988. – 570 с.
2. Горовая, В. И. Творческий потенциал личности и его развитие [Электронный ресурс] / В. И. Горовая, Н. Ф. Петрова. − Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/tvorcheskiy-potentsial-lichnosti-i-ego-razvitie. − Дата доступа : 25.01.2019.
3. Жабицкая, Л. Г. О критериях диагностики литературной одаренности: Художественное творчество. Проблемы комплексного изучения / Л. Г. Жабицкая. − Л., 1983. − С. 139−151.
4. Маслоу, А. Психология бытия / А. Маслоу. − М. : Рефл.-бук, 2003. − 138 с.
5. Пономарев, Я. А. Психология творчества: Тенденции развития психологической науки / Я. А. Пономарев. – М., 1988. – 268 с.

***Г. М. Канцавая***

загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна», кандыдат філалагічных навук, дацэнт (Брэст, Беларусь)

## МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКА ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ ДА ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Метадычная падрыхтоўка настаўніка пачатковых класаў – гэта адзін са складнікаў прафесійнай падрыхтоўкі, якая ажыццяўляецца праз вывучэнне студэнтамі метадычных дысцыплін і праходжанне педагагічных і вытворчых практык. Асноўным вынікам метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў з’яўляецца іх падрыхтаванасць ажыццяўляць педагагічную дзейнасць па навучанні малодшых школьнікаў школьным прадметам, дзейнасць па выхаванні і развіцці навучэнцаў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі як сродкамі вучэбнага прадмета, так і сродкамі працэсу навучання таму ці іншаму школьнаму вучэбнаму прадмету, а таксама падрыхтаванасць да даследчай дзейнасці па праблемах навучання і выхавання вучняў пачатковых класаў. Метадычная падрыхтоўка забяспечвае практычную падрыхтаванасць будучых настаўнікаў пачатковых класаў да паспяховай рэалізацыі дзейнасці па арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраванага на дасягненне новых адукацыйных вынікаў сродкамі канкрэтнай прадметнай галіны ведаў.

Метадычная падрыхтоўка будучага настаўніка пачатковых класаў уключае ў сябе авалоданне студэнтамі методыкамі і тэхналогіямі навучання школьным вучэбным прадметам пры вывучэнні дысцыплін «Методыка

выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання», «Методыка выкладання рускай мовы і літаратурнага чытання», «Методыка выкладання матэматыкі і практыкум па рашэнні задач», «Методыка выкладання прадмета «Чалавек і свет» і інш., у ходзе якіх студэнты знаходзяць абгрунтаваныя адказы на пытанні «З якой мэтай дзеці вывучаюць матэматыку, літаратурнае чытанне, беларускую мову, рускую мову ў цэлым і канкрэтны раздзел, тэму, пытанне, паняцце вучэбнай дысцыпліны?», «Якія асноўныя вынікі навучання таму ці іншаму прадмету?», «Як даведацца, што навучэнцы дасягнулі плануемых вынікаў па вучэбным прадмеце?», «Як неабходна будаваць навучанне, каб кожны вучань дасягнуў плануемых вынікаў на ўзроўні сваіх індывідуальных асаблівасцяў і магчымасцяў?» і інш.

Калі лічыць вынікам метадычнай падрыхтоўкі станаўленне ў настаўніку чалавека, які валодае методыкай, тэхналогіяй навучання, то тады вынік метадычнай падрыхтоўкі можна характарызаваць як здольнасць «арыентавацца і ў метадалогіі, і ў гісторыі, і ў сучасным становішчы вывучаемай навукі» [1, с. 32–33], здольнасць знаходзіць найбольш эфектыўныя метады «данясення» зместу адпаведнай прадметнай галіны ведаў да вучняў, здольнасць да трансфармацыі пэўнага культурнага феномену, уключаючы вопыт сацыяльных адносін, у змест, метад, форму, спецыфічную мову навучання канкрэтнаму прадмету.

Вучэбныя дысцыпліны вучэбнага плана спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» забяспечваюць living рознабаковую арыентацыю будучага настаўніка пачатковых класаў на ўсе сферы педагагічнай дзейнасці: вучэбную дзейнасць навучэнцаў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі і яе метадычнае забеспячэнне, выхаваўчае ўзаемадзеянне з яго даследчапошукавай працай, авалоданне яе методыкай.

Дзейнасць навучання не толькі неаддзельная ад дзейнасці выхавання і развіцця, але і ва ўмовах школьнага навучання, калі асноўная частка часу, што дзіця знаходзіцца ў школе, – гэта час урокаў па розных вучэбных прадметах, павінна рэалізаваць задачы выхавання і развіцця праз адпаведным чынам напоўненае і арганізаванае навучанне.

У метадычнай падрыхтоўцы можна вылучыць тэарэтычны і практычны бок. Тэарэтычны бок метадычнай падрыхтоўкі – гэта не толькі веданне тэарэтычных асноў вучэбнага прадмета, але і авалоданне ведамі пра агульныя заканамернасці навучання адпаведнаму прадмету, веданне канцэпцый і тэорый навучання вучэбнаму прадмету, пэўны ўзровень базавых ведаў зместу вучэбнага прадмета. Тэарэтычны бок метадычнай падрыхтоўкі праяўляецца ва ўменні будучага настаўніка пачатковых класаў даць характарыстыку паняцця і спосабу дзеяння са зместу вучэбнага прадмета, апісаць педагагічныя дзеянні, правесці аналіз зместу школьных падручнікаў на прадмет несупярэчлівасці і навуковасці вучэбных матэрыялаў, іх даступнасці для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Авалоданне методыкамі і тэхналогіямі навучання вучэбнаму прадмету немагчыма без наяўнасці ў студэнтаў адпаведных прадметных ведаў.

Пытанні сувязі вывучэння, напрыклад, матэматыкі і методыкі вывучэння матэматыкі, рускай мовы і методыкі навучання рускай мове, літаратуры і методыкі навучання літаратурнаму чытанню і г. д. заўсёды актуальныя, так як у пачатковай школе немагчымы прамы перанос ведаў з адпаведнай навукі. Навучэнцы I ступені агульнай сярэдняй адукацыі толькі пачынаюць знаёмства з мовай адпаведных прадметаў, і гэта знаёмства павінна адбывацца на мове, даступнай дзецям малодшага школьнага ўзросту. Яно павінна абапірацца на вопыт пачуццёвага пазнання дзяцей, на дашкольны вопыт асваення адпаведнай галіны ведаў. Таму веданне настаўнікам пачатковых класаў беларускай мовы, матэматыкі, рускай мовы, літаратуры і г. д. павінна істотна адрозніваццa ад адпаведных ведаў настаўнікаў-прадметнікаў.

Прадметныя веды настаўніка пачатковых класаў павінны быць не вузка прадметнымі, а такімі, каб настаўнік мог забяспечыць вучням не толькі засваенне, але і «пражыванне ведаў», забяспечыць кожнаму вучню «жывыя веды», якія ўключаюць ў сябе веды пра сябе самога. Чалавек амаль ніколі не мае яснага паняцця пра сябе, і гэта зусім не супярэчыць таму, што ён можа сябе дастаткова добра ведаць. Пазнаючы і перажываючы нешта, мы адначасова пазнаём сябе і гэтым самапазнаннем самавызначаем, змяняем сябе. Такое дзіўнае пераплятанне служыць не толькі матывам да ўдакладнення ведаў, да атрымання новых ведаў, але і крыніцай іх самаразвіцця. Самаразвіццё ведаў можа паглыбляць нашы ўяўленні пра рэальнасць, можа і ўводзіць іх ад яе…» [2, с. 28].

У вучэбным плане спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» прыняты падзел на прадметныя і метадычныя дысцыпліны. Тэндэнцыя да інтэграцыі бачная ў тым, што прадметныя курсы выкладаюцца як курсы, якія ажыццяўляюць метадычную падрыхтоўку.

Найважнейшую частку метадычнай падрыхтоўкі складае практычная падрыхтоўка будучага настаўніка, якая забяспечвае «практычнае валоданне кампанентамі педагагічнай дзейнасці, гатоўнасць вырашаць педагагічныя задачы ў рэальных умовах вучэбна-выхаваўчага працэсу…» [1, с. 32].

Практычная падрыхтоўка забяспечваецца практыкай (педагагічнай, вытворчай) і практыкаарыентаванымі зместам і арганізацыяй практычных і лабараторных заняткаў.

На практычных і лабараторных занятках выкарыстоўваюцца разнастайныя метадычныя практыкаванні: «У якім класе можна прапанаваць гэтае заданне?», «Пры вывучэнні якой тэмы можна прапанаваць вучням такое заданне?», «З якой мэтай вучням прапанавана данае заданне?», «Якія моўныя паняцці могуць быць выкарыстаны пры выкананні гэтага задання?», «На фарміраванне якога паняцця павінна быць накіравана падрыхтоўчая праца?», «На якім этапе вывучэння тэмы можна прапанаваць вучням гэтае заданне?», «Як бы вы арганізавалі дзейнасць вучняў, накіраваную на рашэнне данай задачы?» і інш.

На практычных і лабараторных занятках выкарыстоўваюцца прафесійнаарыентаваныя тэхналогіі і методыкі, якія мадэлююць элементы

будучай прафесійнай дзейнасці, арыентуюць на набыццё студэнтамі вопыту рэалізацыі асноўных відаў метадычнай дзейнасці пры навучанні прадмету з дапамогай імітацыйных формаў адукацыйнага працэсу. Аднак пры гэтым трэба ўлічваць той факт, што ніякая імітацыйная форма, як бы добра яна ні была арганізавана, ніколі не ўзновіць поўнасцю рэальны адукацыйны працэс з нестандартнымі сітуацыямі, якія там узнікаюць.

Пры адпрацоўцы ведання зместу пачатковага лінгвістычнага (матэматычнага) курса, умення карыстацца тэрміналогіяй, якой карыстаюцца вучні, нагляднымі дапаможнікамі, будучыя настаўнікі пачатковых класаў выконваюць таксама розныя віды самастойнай працы: падбіраюць практыкаванні ці складаюць сістэму практыкаванняў для фарміравання ў вучняў ведаў, уменняў і навыкаў на ўсіх этапах працы па прапанаванай тэме; складаюць канспект фрагмента ўрока ці канспект урока па тэме; рыхтуюць дыдактычны наглядны матэрыял, які садзейнічае раскрыццю моўнага (матэматычнага) паняцця, спосабу дзеяння; знаёмяцца з метадычнымі прыёмамі працы настаўніка-практыка (праца з публікацыямі перыядычнага друку); знаёмяцца з рознымі метадычнымі падыходамі да вывучэння тэмы.

Практыкаарыентаваны падыход да метадычнай падрыхтоўкі будучага настаўніка пачатковых класаў рэалізуецца праз пагружэнне будучых спецыялістаў у прафесійную рэальнасць, якое найбольш эфектыўнае пры забеспячэнні дзейнаснай асновы метадычнай падрыхтоўкі, праз разуменне і прынясце будучымі настаўнікамі зменаў, што адбываюцца ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, пераадоленне стэрэатыпаў, набыццё студэнтамі вопыту рэалізацыі асноўных відаў метадычнай дзейнасці. Такое пагружэнне не толькі забяспечвае набыццё будучымі настаўнікамі вопыту выяўлення метадычных праблем, якія стаяць сёння перад настаўнікамі пачатковых класаў, але і дае магчымасць для пошуку іх рашэння, а таксама для праверкі эфектыўнасці знойдзенага рашэння.

Правядзенне часткі практычных і лабараторных заняткаў па методыках выкладання прадметаў пачатковай школы на базе філіяла кафедры, які функцыянуе ў ДУА «Сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя В. І. Хована», накіравана на развіццё ў студэнтаў прафесійных якасцяў у рабочай атмасферы школы.

На вытворчай (педагагічнай і пераддыпломнай) практыцы студэнты пагружаюцца ў прафесійную рэальнасць, апрабіруючы атрыманыя тэарэтычныя веды, практычна авалодваючы кампетэнцыямі педагагічнай дзейнасці ў самых розных умовах. Студэнты сутыкаюцца з цэлай сістэмай педагагічнай дзейнасці на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі: дыдактычным і метадычным уменнем планаваць, арганізоўваць дзейнасць вучняў, накіраваную на авалоданне моўнымі паняццямі, уласцівасцямі і спосабамі дзеянняў такім чынам, каб яе вынікам з'явілася не толькі засваенне ведаў, уменняў і навыкаў, але і выхаванне і развіццё дзяцей.

Такім чынам, метадычная падрыхтоўка будучых настаўнікаў пачатковых класаў з'яўляецца важным складнікам іх прафесійнай падрыхтоўкі да працы ў сучаснай школе.

*Спіс літаратуры:*

1. Сериков, В. В. Обучение как вид педагогической деятельности / В. В. Сериков. – М. : Издательский центр «Академия», 2008. – 256 с.

2. Зинченко, В. П. Психологическая педагогика : материалы к курсу лекций. Часть I. Живое Знание. – Самара, 1998. – 216 с.

***Е. И. Карпенина***
заместитель директора по учебной работе ГУО «Вспомогательная школа № 1 г. Гродно» (Гродно, Беларусь)

## ОРГАНИЗАЦИЯ ОРГАНИЗАЦИОННО-СМЫСЛОВОГО АСПЕКТА ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ СРЕДЫ ДЛЯ УЧАЩИХСЯ С РАССТРОЙСТВАМИ АУТИСТИЧЕСКОГО СПЕКТРА В УСЛОВИЯХ ВСПОМОГАТЕЛЬНОЙ ШКОЛЫ

Расстройства аутистического спектра представляют собой нарушение, характеризующееся наличием искаженного развития с дефицитом коммуникативных способностей, поведенческими и двигательными стереотипиями. Включение детей с расстройствами аутистического спектра в совместное с другими детьми обучение предполагает, прежде всего, изменение (специальную адаптацию) образовательной среды. Специальная организация образовательной среды в школах, создавших условия для обучения и воспитания детей с расстройствами аутистического спектра, существенно облегчает протекание педагогического процесса. Данная деятельность осуществляется с опорой на знание ограничений жизнедеятельности – тех трудностей, которые испытывает эта группа учащихся во взаимодействии с окружающим миром.

Одной из значимых особенностей учащихся с расстройствами аутистического спектра является нарушение социального взаимодействия, которое затрудняет процесс восприятия и познания другого человека и построение на этой основе позитивных коммуникативных отношений и включение в совместную деятельность. Перечисленные особенности создают существенные трудности для адаптации учащихся данной категории в условиях вспомогательной школы. Для преодоления данных трудностей учащийся с расстройствами аутистического спектра должен получить опыт совместной деятельности, приобрести средства взаимодействия с другими людьми. Реализация подобных задач возможно только при организации соответствующей образовательной среды.